# За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 6 (101) Сакавік 2015 г.


# Праваабаронца Леанід Сьвецік: Я зьдзіўлены рэакцыяй парлямэнтароў

**Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве, разгледзеўшы зварот віцебскага праваабаронцы Леаніда Сьвеціка, палічыла немэтазгоднай распрацоўку і зацьвярджэньне пераліку захворваньняў, пры наяўнасьці якіх можа разглядацца пытаньне аб вызваленьні хворых грамадзян ад адміністрацыйнага арышту і замене яго больш мяккімі пакараньнямі.**

Яшчэ ў сьнежні 2014 году Леанід Сьвецік зьвярнуўся ў парлямэнт краіны з прапановай, у якім прасіў зьвярнуцца ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь з даручэньнем распрацаваць папраўкі ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэньнях (КаАП) з улікам Пераліку захворваньняў Міжнароднай статыстычнай класіфікацыі хваробаў і праблемаў, зьвязаных са здароўем, 10-га перагляду (МКБ-10). Гэтая Міжнародная клясыфікацыя хваробаў, распрацаваная Сусьветнай арганізацыяй аховы здароўя, са студзеня 2007 году зьяўляецца агульнапрынятай клясыфікацыяй для кадаваньня мэдычных дыягназаў.

**Віцебскі праваабаронца, зьвяртаючыся ў ПП НС РБ, зыходзіў з таго, што ў дзеючым КаАП адсутнічае канкрэтны пералік захворваньняў, якія перашкаджаюць адбываньню адміністрацыйнага арышту.**

Так, у частцы 2 артыкулу 6.7 КабАП не ўтрымліваецца прамога ўказаньня на тое, што асобы з наяўнасьцю шэрагу захворваньняў ня могуць быць арыштаваныя.

Артыкул 8.6 КаАП прадугледжвае вызваленьне ад адміністрацыйнага спагнаньня або замену адміністрацыйнага спагнаньня больш мяккім з прычыны захворваньня. Аднак якія захворваньні і ў якой стадыі — у гэтым артыкуле не ўдакладняецца. Гэтая акалічнасьць дае магчымасьць шырока трактаваць праваппрымяняльнікам дыспазыцыю гэтага артыкулу і часьцяком прыводзіць да парушэньня правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

Атрымаўшы адказ ад беларускіх парлямэнтароў, Леанід Сьвецік выказаў зьдзіўленьне гэткай негуманнай рэакцыяй на яго прапанову. Паводле словаў праваабаронцы, праблема ўдасканаленьня заканадаўства ёсьць прамая функцыя парлямэнту. Адсутнасьць пераліку захворваньняў, якія перашкаджаюць адбываньню адміністрацыйнага арышту, зьяўляецца прагалам ў заканадаўстве, ускладняе адпраўленьне правасудзьдзя і ўшчамляе правы вялікай катэгорыі грамадзян.



Леанід Сьвецік

Праваабаронца прывёў прыклад з асуджэньнем да адміністрацыйнага арышту асоб, якія пакутуюць на псыхічныя захворваньні. Паводле статыстычных дадзеных, кажа Леанід, кожны восьмы беларус пакутуе на псыхічныя разладзьдзі і разладзьдзі паводзінаў, якія патрабуюць аказаньня мэдычнай дапамогі. Неадмыслоўцам, якімі зьяўляюцца работнікі міліцыі і судзьдзі, часам складана распазнаць у чалавеку некаторыя захворваньні і разладзьдзі. І гэтая катэгорыя хворых можа быць лёгка асуджаная на адбываньне адміністрацыйнага арышту.

Да іх належаць, напрыклад, хворыя на дэпрэсію, якую цяжка распазнаць нават лекарам-псыхіятрам. У выніку — асуджэньне на адміністрацыйны арышт грамадзян, якія пакутуюць на дэпрэсію, і адбываньне імі арышту ў ізалятары часовага ўтрыманьня — у месцы, якое небясьпечнае для людзей, якія пакутуюць на псыхічныя захворваньні.

**Леанід Сьвецік мяркуе, што дэпутатам парлямэнту рана ці позна давядзецца вярнуцца да разгляду пытаньня аб распрацоўцы і зацьвярджэньні пераліку захворваньняў, пры наяўнасьці якіх можа разглядацца пытаньне аб вызваленьні хворых грамадзян ад адміністрацыйнага арышту і замене яго больш мяккімі пакараньнямі. Бо гэтае пытаньне ўжо вырашанае станоўча ў некаторых краінах – чальцах Саюзнай дзяржавы Беларусі і РФ, МС і Эўразійскага эканамічнага саюзу. У той жа Расеі, напрыклад, у сьнежні 2014 году рашэньнем расейскага ўраду зацьверджаны пералік захворваньняў, якія перашкаджаюць адбываньню адміністрацыйнага арышту.**

# ПОЛАЦКІ СУД ПЕРАШКАДЖАЕ ПРАФСАЮЗУ АБАРАНЯЦЬ РАБОЧЫХ

**Судзьдзя Полацкага суду не дапусьціла юрыста Свабоднага прафсаюзу абараняць інтарэсы рабочых у судовым паседжаньні. Дырэктар крамы «Аліса-Плюс» падаў у суд пазоў на трох былых работнікаў для кампэнсацыі нястачы амаль у 22 мільёны рублёў, работнікі з пазовам ня згодныя. Двое з трох былых рабочых крамы зьяўляюцца сябрамі Свабоднага прафсаюзу, але якраз у гэтым і засумнявалася судзьдзя.**



Мікалай Шарах

На папярэднім паседжаньні суду 6 сакавіка Віктар Расьлякоў, які працаваў раней у краме ахоўнікам, заявіў хадайніцтва аб дапушчэньні юрыста Свабоднага прафсаюзу Мікалая Шараха. Суду былі дадзеныя дакументы, якія пацьвярджаюць законнасьць удзелу прафсаюзнага юрыста: заявы аб уступленьні ў прафсаюз, даверанасьць юрыста прадстаўляць інтарэсы сябраў Свабоднага прафсаюзу Беларускага і Статут СПБ.

Судзьдзя Ірына Даротка палічыла, што гэтыя дакумэнты не пацьвярджаюць факт сяброўства спадара Расьлякова у СПБ і запатрабавала прадставіць дакумэнт з рашэньнем кіруючага органу прафсаюзу аб прыёме Віктара Расьлякова ў Свабодны прафсаюз. Юрыст Віцебскай калегіі адвакатаў, які прадстаўляе інтарэсы дырэктара крамы, таксама была супраць удзелу абароноцы рабочых ад Свабоднага прафсаюзу.

Юрыст СПБ Мікалай Шарах: «Яшчэ не было такога выпадку, каб мяне не дапускалі прадстаўляць у судзе інтарэсы сябраў прафсаюзу. Да гэтага выпадку ўсіх судзьдзяў задавальняла ў якасьці пацьверджаньня сяброўства ў прафсаюзе работніка копія ягонай заявы аб уступленьні ў прафсаюз. Такія паводзінаў судзьдзі толькі зацягваюць разгляд гэтай справы».

**Актывісты Свабоднага прафсаюзу мяркуюць, што была парушаная Канвэнцыя міжнароднай арганізацыі працы №87 аб свабодзе аб'яднаньня ў прафсаюз. Гэтая канвэнцыя забараняе дзяржаўным органам умешвацца ў арганізацыйную дзейнасьць прафсаюзу. А судзьдзя стала камэнтаваць Статут прафсаюзу і загадваць, якім чынам павінен быць арганізаваны прыём рабочых у прафсаюз.**



Віктар Расьлякоў

Судзьдзя Ірына Даротка запатрабавала ад рабочых: «Падайце да наступнага паседжаньня рашэньне прафсаюзу аб прыняцці адказчыкаў у прафсаюз. Калі ня хочаце, такім чынам, я Вам растлумачваю права наняць адваката, які знаходзіцца ў юрыдычнай кансультацыі ў нашым будынку».

Рабочыя заявілі хадайніцтва аб адводзе судзьдзі, паколькі была створаная перашкода рабочым мець прадстаўніка для абароны іх эканамічных інтарэсаў. Бо дырэктар крамы Юры Савін просіць суд спагнаць з трох былых рабочых у агульнай складанасьці амаль 22 мільёны рублёў (7 827 000 + 10 222 100 + 3 831 500 = 21 880 600 бел. руб.). Судзьдзя Ірына Даротка адхіліла гэтае патрабаваньне рабочых і працягнула судовае паседжаньне. Але пасьля, па хадайніцтве рабочых, судзьдзя вымушаная была абвясьціць перапынак у судовым паседжаньні да 11 сакавіка, каб рабочыя змаглі наняць адваката.

Падтрымаць рабочых у суд прыйшлі сябры Свабоднага прафсаюзу. На думку рабочых, судзьдзя больш лаяльна ставіцца да адваката, які прадстаўляе дырэктара крамы Юрыя Савіна, чымся да былых работнікаў крамы. Але ў габінэце судзьдзі колькасная перавага была на баку працоўных: шэсьць рабочых супраць траіх — судзьдзі, сакратара і адваката дырэктара.

Суд праходзіў ня ў залі паседжаньняў, а ў габінэце судзьдзі. Судзьдзя гэта патлумачыла праблемамі з кампутарам сакратара. У габінэце крэслаў хапіла якраз усім прысутным. Сама судзьдзя не была апранутая ў судовую мантыю, аддала перавагу звычайнай цывільнай вопратцы...

# Гарвыканкам прызнаў парушэньне Закону аб мовах намесьніцай старшыні раённай адміністрацыі

Скаргу на службовую асобу ў Віцебскі гарвыканкам падавалі **сябры КХП-БНФ Ян Дзяржаўцаў**, **Пятро Сарапеня** і **Алег Емяльянаў**. **Намесьніца старшыні адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску Вольга Гурчанка** адказала на іх заяўку на пікет, складзеную па-беларуску, на расейскай мове. Гэткім чынам, на думку скаржнікаў, чыноўніца парушыла Закон аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, які патрабуе ад службоўцаў адказваць на мове звароту.

Адказ на скаргу падпісаў **намесьнік старшыні гарвыканкаму Дзьмітры Шэрыкаў**. Згодна з гэтым адказам, Гурчанка згаданы закон не парушыла. Маўляў, парадак падачы і разгляду заявак на правядзеньне масавых мерапрыемстваў рэгулюецца Законам аб масавых мерапрыемствах, а Закон аб зваротах грамадзян не тычыцца тых зваротаў, у дачыненьні да якіх заканадаўчымі актамі вызначаны адмысловы парадак іх падачы і разгляду.

Тым ня менш гарвыканкам прызнаў, што чыноўніца парушыла іншы закон — аб мовах: «Артыкулам 5 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" гарантавана права грамадзян атрымліваць адказ на зварот на мове звароту. За парушэньне артыкулу 5 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" у дачыненьні да намесьніка кіраўніка Першамайскага раёну г. Віцебску Гурчанкі В.В. будуць прыменены меры дысцыплінарнага характару».

Што гэта за «меры дысцыплінарнага характару» — намесьнік кіраўніка Віцебскага гарвыканкаму не ўдакладніў.

# Глыбоцкая дворнічыха другі год ня можа дамагчыся пераводу на больш лёгкую працу

У жанчыны трэцяя група інваліднасьці па зроку, але яе кіраўніцтва мяркуе, што гэта не замінае цягаць цяжкія мяхі са сьмецьцем.

**Аксана Мушкат** уладкоўвалася прыбіраць пад'езды ў дамох. Аказалася, трэба і на сьметнік езьдзіць, сьмецьце сартаваць, і на розныя іншыя працы па горадзе. Калі ж Аксана стала адмаўляцца выконваць гэтыя абавязкі, ёй сталі ставіць менш працоўных гадзін, адпаведна, і зарплата стала меншая. А жанчыне трэба выплачваць яшчэ і крэдыт за рамонт кватэры.

Спрэчкі з працадаўцам расьцягнуліся не на адзін год. Аднак 4 сакавіка яе выклікалі на паседжаньне камісіі па працоўных спрэчках. Незалежных журналістаў, якіх запрасіла Аксана, камісія туды не дапусьціла, ім давялося чакаць за дзьвярыма. Не дазволілі Аксане і рабіць аўдыёзапіс паседжаньня. Разгляд справы цягнуўся каля дзьвюх гадзін.

*"Дзяўблі, што яны ва ўсім маюць рацыю, а я вінаватая, — расказала жанчына пра ход паседжаньня. — Зрабілі зь мяне авечку — я вінаватая, і ўсё. Зрабілі зь мяне інваліда, маўляў, гэта яны ідуць мне на саступкі, што трымаюць мяне тут".*

Аксана паводле адукацыі бухгальтар, але такой працы ёй даць ня могуць.

*"У нас няма працы, тут МРЭК (мэдычная камісія) прызначае, што я магу на пасадзе бухгальтара працаваць. Зразумела, я сказала, што магу быць бухгальтарам. Мне сказалі, што ім трэба бухгальтар з вышэйшай адукацыяй".*

Майстар ЖКГ Аляксандра Плыгаўка з журналістамі размаўляць адмовілася.

Паводле слоў начальніцы Аксаны, зьбіраць па горадзе паперкі — праца ня цяжкая. Аднак жанчына з гэтым ня згодная:

*"Паперкі, ну... Гэта цэлы дзень так адхадзіць, нагрузка на вочы ў мяне ідзе. Цягаць мяшкі са сьмецьцем з аднаго канца гораду ў другі — гэта, відаць, лёгка для іх, пясок цягаць. Калі атрымоўваецца, пад'яжджаюць, а калі не атрымоўваецца, пешшу трэба хадзіць".*

Былы начальнік Аксаны Віктар Філіпенка сьцьвярджае, што звальняць Аксану ніхто не зьбіраецца. Яе накіравалі на мэдычную камісію, па выніках будзе прынятае рашэньне.

*"Ніхто ж яе не звальняе. Трэба афіцыйна паперу прадставіць, пацьвердзіць дакумэнты. Дык яна ж адразу іх не аддала, трымала ў сябе. Пройдзе камісію, гэтыя дні аплацяцца ёй. Здаровая, дык здаровая, хай працуе, у чым пытаньне. Тут жа ніхто пакрыўдзіць яе ня хоча, гэта ня наша задача"*, — кажа Віктар Філіпенка.

Пакуль Аксана зьбіраецца прайсьці камісію і спадзяецца, што прыцягненьне ўвагі грамадзкасьці праз СМІ дапаможа ёй вырашыць праблему.

# Незалежнаму журналісту забаранілі прайсьці са здымачом ў Глыбоцкі райвыканкам




**Глыбоцкага незалежнага журналіста Зьмітра Лупача не пусьцілі ў райвыканкам з фотаапаратам у торбе.**

**Паводле спадара Лупача, ён скіроўваўся ў аддзел эканомікі перадаць дакумэнты, якія тычацца ягонага прыватнага прадпрымальніцтва: "Я ішоў з торбай. Міліцыянт, які дзяжурыць пры ўваходзе, папрасіў паказаць, што там ляжыць. А ўнутры ляжаў фотаапарат "Nikon". Тут міліцыянт заявіў, што "з прафэсійнымі фотаапаратамі" ўваход у райвыканкам забаронены – маўляў, ёсьць такое распараджэньне кіраўніка спраў райвыканкаму. Добра, што мы былі ўдвох зь сябрам, якому я пакінуў торбу са здымачом, пакуль хадзіў аддаваць паперы".**

Заадно Зьміцер Лупач вырашыў завітаць і да кіраўніцы спраў райвыканкаму — распытаць, чым выкліканая забарона мець здымачы ў грамадзкім будынку (дзе, дарэчы, месьціцца ня толькі райвыканкам, але і шэраг грамадзкіх арганізацыяў, у тым ліку і мясцовы ЗАГС).


"Як быць у тым выпадку, калі давядзецца фатаграфаваць вясельле? Я ж зарэгістраваны прыватным прадпрымальнікам, і адзін зь відаў маёй прадпрымальніцкай дзейнасьці — гэта якраз фатаграфаваньне. Дужа карцела запытацца пра гэта ў кіраўніцы спраў райвыканкаму Іны Анатольеўны Пачопкі. Але мне сказалі, што яна пайшла на нараду, і яшчэ дзьве гадзіны я тэлефанаваў да яе ў габінэт, каб даведацца, што да чаго. Урэшце працоўны дзень скончыўся, а адказу я так і не атрымаў", — распавёў спадар Лупач.

На сайце райвыканкаму ён адшукаў тэлефонны нумар "гарачай лініі" для "апэратыўнага вырашэньня сацыяльна-побытавых праблем". Аднак апэратыўнага вырашэньня не адбылося: журналісту сказалі, што гэта нумар прыёмнай выканкаму, і што там ніколі ня чулі пра распараджэньне наконт "прафэсійных фотаапаратаў".

Зьміцер Лупач вырашыў наступнага ж дня зьвярнуцца ў выканкам з афіцыйным запытам — якую канкрэтна фотатэхніку там лічаць "прафэсійнай", і чым выкліканыя такія надзвычайныя захады перасьцярогі.

## Леаніда Аўтухова выпрашылі прыстрашыць падатковай інспэкцыяй

**Актывіста выклікалі ў падатковую інспэкцыю, каб ён даў справаздачу пра свае даходы за апошнія 10 гадоў. Леанід Аўтухоў папрасіў даць дэкларацыю на беларускай мове, аднак яму адмовілі і заявілі, што згодна з пастановай Савету Міністраў дэкларацыі павінны быць толькі парасейску. Таксама ў выпадку адмовы запаўненьня дэкларацыі актывіста прыстрашылі, што на яго складуць пратакол.**



Леанід Аўтухоў

Перад выклікам у падатковую Леанід Аўтухоў дапамагаў сем'ям з аграгарадка Верамееўка ў Гарадоцкім раёне. Дзьве сям'і зь непаўнагадовымі дзецьмі засталіся без электрычнасьці. Яны займаюць службовыя кватэры ад прадпрыемства «Райаграснаб», аднак паколькі спынілі працоўныя адносіны з гэтым прадпрыемствам, павінны вызваліць і кватэры. Пры гэтым была парушаная заканадаўчая працэдура.

«Што робяць яны наогул?! Я сам быў у жаху. Я толькі даведаўся, калі пачуў у судзе, што дзяўчына плача. Пытаюся: што здарылася? Яна кажа: адключаюць сьвятло. Потым прыяжджае апякунства. Лядоўня не працуе, умоваў для жыцьця ніякіх. Забіраюць дзетак проста. Забіраюць прымусова. Ты застаесься безь дзетак. І калі не падымаць "шухеру"... Але цяпер зло на мяне маюць», — пракамэнтаваў сытуацыю Леанід Аўтухоў.

# У Віцебску забаранілі пікет у Дзень Волі

Адміністрацыя Чыгуначнага раёну Віцебску зноў адмовіла сябрам Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ ў правядзеньні пікету. Імпрэза, прымеркаваная да Дня Волі, мусіла адбыцца 25 сакавіка. Заява была пададзеная ад імя Яна і Аляксандра Дзяржаўцавых, Пятра Сарапені, Алега Емяльянава і Аляксея Леаненкава.

Напярэдадні сьвята кожны з заяўнікаў атрымаў цалкам ідэнтычны адказ, падпісаны намесьніцай кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёну Натальляй Ляпёшкінай: "...заява разгледжаная", "...дагаворы, прадугледжаныя пунктам 3 рашэньня Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту ад 10 ліпеня 2009 году №881 "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску", Вамі не прадстаўленыя, забараняю правядзеньне масавага мерапрыемства — пікету 25 сакавіка 2015 году з 15:00 да 16:00 у парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў у раёне сцэнічнай пляцоўкі".

Пасьля прыняцьця вышэй згаданага рашэньня Віцебскага гарвыканкаму №881 апазыцыйным актывістам так ні разу і не было дазволена правядзеньне хоць якога-небудзь мерапрыемства. Гэткім чынам, на працягу амаль шасьці гадоў гарадзкія ўлады беспакарана парушаюць канстытуцыйныя правы грамадзянаў, якім артыкулам 35 Найвышэйшага закону краіны гарантаванае права на выказваньне іхнай грамадзянскай ды палітычнай пазыцыі, у тым ліку празь пікеты і іншыя дазволеныя законам акцыі. Артыкул 35 гарантуе *"свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў і пікетаваньня, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, (гэтае права) гарантуецца дзяржавай. Парадак правядзеньня названых мерапрыемстваў* ***вызначаецца законам****.*

Заўважце, парадак вызначаецца "**законам**", а не рашэньнем "гарвыканкаму", які, як вядома кожнаму школьніку, законаў не прымае.

Гэтае рашэньне складзенае гэткім чынам, што выканаць яго ў поўным аб'ёме не ўяўляецца магчымым. Як кажа Ян Дзяржаўцаў, нават праз суд грамадзкія актывісты ні разу ня здолелі змусіць галоўнага ўрача "Віцебскай гарадзкой цэнтральнай паліклінікі" хаця б раз заключыць зь імі дамову на абслугоўваньне мерапрыемства, бо ў законе адсутнічае адпаведная норма ўплыву на службовую асобу.

І гэтым разам галоўны ўрач Станіслаў Цітовіч адмовіў чальцам КХП-БНФ у заключэньні дамовы, спаслаўшыся на тое, што ў *"...сапраўдны* перыяд назіраецца высокая *абарачальнасьць* насельніцтва..." (дaслоўна) і заключэньне дамовы *"не ўяўляецца магчымым"*, бо загадзя сплянаваць дзейнасьць брыгад на прызначаны для мерапрыемства час, як ён мяркуе, немагчыма.

Намесьнік начальніка УУС Віцебскага аблвыканкаму А. Міхайлаў у пошуках прычынаў для адмовы пайшоў іншым шляхам. Ён спаслаўся на адсутнасьць рашэньня адміністрацыі Чыгуначнага раёну, якое б дазваляла правядзеньне пікету заяўнікам. Маўляў, будзе дазвол райвыканкаму — мы адразу ж пад казырок, на месцы правядзеньня пікету будзем раней за вас. Але ж казуістычнасьць справы заключаецца ў тым, што без дамовы з УУС райвыканкам дазволу на правядзеньне акцыі ня дасьць. Вось і паспрабуйце адшукаць у гэтай справе крайняга.

Адзінай арганізацыяй, якая без праблемаў заключае з апазыцыйнымі палітыкамі дамовы на абслугоўваньне, зьяўляецца "Зелянгас". Мо' таму, што чым бліжэй чалавек да прыроды, тым менш у ім хлусьні і бруду, тым больш ён разумее, што ні ўласна чалавечую прыроду, ні прыроду ў больш шырокім сэнсе гэтага слова не падманеш. Усё астатняе ад лукавага.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.